**«Мове роднай вучыцца!»**

## Сістэма работы па авалоданні мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры

**А. А. Ісаева,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 5 г.Магілёва

Сёння, калі ў краіне ідзе адраджэнне нацыянальнай культуры, нацыянальнай свядомасці, калі мяняецца наша мысленне і ідзе пераацэнка каштоўнасцей, мы ўсе часцей звяртаемся да спадчыны свайго краю, яго гісторыі і культуры.

Народ жыве, калі гучыць мова, жывуць традыцыі, ёсць спадчына. І святы абавязак кожнага беларуса – ведаць сваю спадчыну, свае карані і зберагаць свае традыцыі.

Мова – частка чалавечай культуры, гістарычнай спадчыны.

Родная мова з'яўляецца тым ланцужком, які звязвае чалавека з Радзімай, з продкамі, з самабытнай культурай прашчураў. Вельмі важна ўсведамляць сябе прадстаўніком нацыі, носьбітам і захавальнікам спадчыны свайго народа.

Без ведання сваіх вытокаў немагчыма па-сапраўднаму палюбіць родны край, яго спадчыну, стаць патрыётам.

Але як мала мы, беларусы, ведаем і любім сваю мову і сябе! Сёння востра стаіць пытанне захавання беларускай культуры і мовы. Таму і ўзнікла неабходнасць мэтанакіраванай працы па фарміраванні нацыянальнай свядомасці ў вучняў праз вывучэнне нацыянальнуай культуры як фундаментальнай духоўнай каштоўнасці народа.

Родная мова з'яўляецца не толькі прадметам навучання, але і сродкам пазнання, развіцця і выхавання. Таму імкнуся абудзіць у сваіх вучняў павагу

да роднага слова, працэсу пазнання, жаданне вывучаць сваю культуру, захапляцца дзівосным светам прыроды і ахоўваць яго. Далучаю вучняў да гісторыі, духоўнай культуры свайго народа, яго традыцый і здабыткаў у час працы з вучэбнымі тэкстамі, у якіх расказваецца пра Беларусь і беларусаў. Прапаноўваю сваім вучням разнастайныя віды работ.

Напрыклад:

**Тэма: «Цяперашні і будучы час дзеяслова»**

Гучыць музыка «Калядкі»

– Што можна рабіць пад гэту музыку? (Танцаваць, спяваць, рухацца, весяліцца)

– Якія часціны мовы вы назвалі? (Дзеясловы)

Эпіграф:

Гэй, весялей ты збірайся, народ!
Крочыць вясна па планеце ўжо,
Закрочыць і радасцю сэрца займае,
Вось гэта свята вясны нас чакае.

– Назавіце дзеясловы ў другім сказе і вызначце іх час.

**Фізкультхвілінка**

– А зараз давайце крыху адпачнём. Спачатку практыкаванні для вачэй на экране, а потым пад песню «Калядачкі» робім фізічныя практыкаванні. Гучыць песня «Калядачкі»

Скажыце, калі ласка, якому беларускаму святу прысвечана песня? А музыка ў пачатку ўрока? А эпіграф? (Песні, музыка – свята «Каляды», эпіграф – свята «Гуканне вясны»)

– А якое свята вы адзначалі ўчора? (Вялікдзень)

– А якое вясновае свята ў хуткім часе будзе адзначаць наш народ? (Радаўніца)

– Якое яшчэ свята прысвечана памінанню продкаў? (Дзяды)

Вучні атрымалі індывідуальнае дамашняе заданне пра святы Дзяды і Радаўніцу, давайце іх паслухаем.

Заданне. Запісаць тэкст, уставіць прапушчаныя арфаграмы  і пунктаграмы, растлумачыць; вызначыць час, лік, асобу ці род, трыванне дзеясловаў.

Радаўніца – дзень памінання памерлых, на які са стараж(ы)тных часоў а(д)бываліся трапезы на магілах бацькоў і блі(з)кіх сваякоў. Радаўніца заўсёды будзе адзначацца  праз тыдзень пасля (В)ялікадня ў аўторак. Спачатку ідуць памінаць блі(з)кіх у царкву, а потым на могілкі. І хоць існуе звычай памінальнай трапезы, калі вялікоднае яйка трэба пакідаць «для спачылых», праваслаўная царква (не) ўхваляе гэтага звычаю, паколькі лічыцца, што памерлым патрэбна толькі малітва і добрыя справы ў памяць пра іх. У гэты дзень непажадана было штос(ь)ці сеяць.

Вывучаючы часы дзеяслова, мы з вамі  ўспомнілі народныя святы, звярнуліся да нашага мінулага. Вы павінны ведаць, што без мінулага не можа быць сучаснасці і будучыні. Таму ведаць народныя святы, звычаі, традыцыі – наш святы абавязак.

Дамашняе заданне. Распытаць у старэйшых, як у вашай сям'і спраўляюць святы «Дзяды» або «Радаўніцу» і напісаць міні-сачыненне на тэму «Як у нашай сям'і спраўлялі «Дзяды», ужываючы дзеясловы прошлага часу, ці «Як у нашай сям'і спраўлялі « Радаўніцу», ужываючы дзеясловы  будучага і цяперашняга часу.

**Тэма «Дзеяслоў як часціна мовы»**

Практыкую і такі від работы, як выбарачнае пісьмо. Напрыклад, з тэксту верша выпісаць неабходныя часціны мовы (у дадзеным выпадку – дзеясловы).

Мы – як чужынцы на вуліцах нашых.
Дзе, і ў каго, і пра што не спытай –
Па-беларуску ніхто не адкажа,
Хочаш, каб слухалі – мову мяняй.
Мы – як чужынцы. Нас не разумеюць
Ні кіяскёры, ні культпрацаўнік.
Па-беларуску гаворыш – падзея

Для мінчука, што ад мовы адвык.
Мы – як чужынцы. Калі на праспекце
Чуеш гаворку на мове бацькоў –
Радасць такая, як быццам бы стрэціў
Недзе ў Анголе сваіх землякоў.
Мы – нібы прыхадні ў нашай сталіцы,
Мовай «вясковай» кляймёны наш рот.
Што ж нам рабіць?
Мове роднай вучыцца!
Мова памрэ, а за ёю – народ.

**Тэма. Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова**

Беларус любіць смачна паесці…

Хлеб дае сілу чалавеку для жыцця. Кінуць яго – смяротны грэх. Хлеб у нас жытні, вельмі духмяны. Пякуць яго на подзе, калі печ выпалена і з яе вымецена вуголле. У цеста дабаўляюць вараную тоўчаную бульбу, каб хлеб быў мяккі і пульхны. Спечаны хлеб клалі на ручнік і накрывалі ручніком, каб астываў. Пакуль хлеб астывае, хату напаўняе найлепшы ў свеце пах.

- ✓ Вызначце тэму і асноўную думку.
- ✓ Выпішыце сказы, у якіх ужываюцца дзеепрыметнікі.
- ✓ Лексічная работа: под – ніз печы.
- ✓ Знайдзіце дзеепрыметнікі, пастаўце да іх пытанні і падкрэсліце як член сказа.

**Тэма «Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў -н-, -ан-, -ен-, -т-»**

Дзелавая гульня «Карэктар». Вучні атрымліваюць карткі з тэкстам, у якім дапушчаны памылкі.

Уваходзіны

Дом збудаваны, наступіў час перасялення. Звычайна першым у хату ішоў гаспадар з гаршком, напоўненным жарам з вуголем. За ім хатнія неслі нажытую маёмасьць. Гаспадар абносіў гаршчок уздоўш сцен, спыняючыся на імгненне ў кожным куце. Потым ставіў гэты гаршчок на прыпечак і адразу

запальваў у печы падрыхтаванныя дровы. А напярэдадні ў новы дом праз акно запускалі пеўня ці курыцу. Калі спужаны певень спеваў, то гэта лічылася добрым знакам, калі ж не – дрэнным.

- ✓ Тлумачэнне *н*езразумелых слоў: уваходзіны – новоселье; маёмасць – имущество, состояние.
- ✓ -Выправіць дапушчаня памылкі і растлумачць правапіс слоў.
- ✓ -Выпісаць дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу, абазначыць суфіксы.

Дамашняе заданне: запісаць мясцовыя прыкметы, павер'і, звязаныя з абрадам «Уваходзіны», ужываючы дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу.

**Тэма «Дзейнік і спосабы яго выражэння»**

<u>Калектыўная работа з тэкстам, запісаным на дошцы:</u>

Абрад «Жаніцьба коміна» (з,с) праўлялі двойчы на год. А(д, т)бывалася гэта 14 верасня на Сямёнаў дзень і вясной, пра(з,с) тыдзень пасля Вялікадня. Вызваліўшыся а(д,т) сельскагаспадарчых работ у полі і на агародзе, сяляне збіраліся на вячоркі. Вось тут урачыста запальвалася лучына і «жаніўся» комін. Гэта сімвалізавала пачатак хатніх работ, вячорак і заканчэнне работ у полі.

- ✓ Лексічная работа са словамі вячоркі, лучына.
- ✓ Ратлумачыць арфаграмы.
- ✓ Назавіце граматычныя асновы ў кожным сказе, вызначце, чым выражаны дзейнік.

<u>Работа з тэкстам (раздаецца кожнаму вучню)</u>

Забытае неабходна шанаваць

Заўтра наступіць, калі помніць пра ўчора. І шанаваць яго – значыць не быць па-за часам.

У вёсках раней існаваў звычай штогод праводзіць абрад пад назвай «Жаніцьба коміна».

Комін – гэта невялічкая труба, сплеценая з прырэчнай лазы і абмазаная глінай, якая прымацоўвалася да адтуліны ў столі. Пад трубой вешалі пасвет

(лучнік) – патэльню ці квадрат металічнай рашоткі. Там гарэла лучына. Яна і асвятляла хату селяніна ў восеньскія і зімовыя вечары.

Сямёнаў дзень быў вясёлым святам.

Прыгатаваўшы ўсё неабходнае для вячэры, гаспадыня абвязвае комін і лучнік новымі ручнікамі, гаспадар прыносіць свежага мёду ў сотах. Пасля гэтага абое рыхтуюцца да вячэры. Стол накрываецца новым абрусам і ставіцца пры самай печы ці пад лучнікам.

Калі сям'я павячэрае, гаспадыня прыносіць у фартуху гарбузікі, сыпле іх на комін, а на стол кладзе ласункі. Дзеці і моладзь збіраюць рассыпаныя семкі і бяруцца за салодкае. Тады гаспадыня прапаноўвае праспяваць «жаніху», коміну, вясельную песню «Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі».

Старэйшыя часта перапыняюць спяванне блаславеннямі: «Каб так рана ўставалі і шчыра працавалі, як спявалі!»

- ✓ Лексічная работа з незразумелымі словамі.
- ✓ Знайсці ў сказах дзейнікі; вызначыць, чым яны выражаны, і запісаць такія сказы ў табліцу ў якасці прыкладаў.

| Спосаб выражэння дзейніка | Прыклады |
|---|---|
| Назоўнік у назоўным склоне | |
| Займеннік у назоўным склоне | |
| Прыметнік у значэнні назоўніка | |
| Дзеепрыметнік | |
| Лічэбнік | |
| Інфінітыў | |
| Непадзельнае словазлучэнне | |
| Прыслоў | |
| Выклічнк ці службовая часціна мовы | |

**Тэма «Аднасастаўныя сказы»**

Прачытаць пачатак апавядання. Закончыць яго, ужываючы пэўна-асабовыя і няпэўна-асабовыя сказы.

Адметнай рысай характару беларуса з'яўляецца яго шчодрасць, гасціннасць і памяркоўнасць. Без гэтых рыс характару цяжка ўявіць сённяшняга беларуса.

**Тэма «Разрады прыметнікаў»**

Перакласці тэкст на беларускую мову, вызначыць разрады прыметнікаў.

Облик Могилёва – города над Днепром, которому более 740 лет, – определяет тесное переплетение богатейших культурных традиций седой старины и новейших тенденций, обусловленных социально-экономическим развитием современного крупного индустриального центра Республики Беларусь. Могилёв расположен на пересечении важнейших транспортных магистралей, связывающих его с Россией, Украиной, Прибалтикой и Польшей.